КРЫВІНКА

САКАВІК
№ 4 (140)
2014 год

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА



МЯСЦОВАЯ КАМПАНІЯ

ВЫСТУП ПА РАДЫЁ КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ Г.СТАНКЕВІЧА

Дарагія сябры!

Я ведаю, што мяне падтрымлівае вялікая колькасць людзей. 90% з тых, да каго я звяртаўся пры зборы подпісаў, падпісваліся і жадалі поспехаў. Па сваёй акрузе я сабраў подпісы большай паловы выбарцаў. Калі гэтыя людзі прагаласуюць за мяне ў дзень выбараў, тых галасоў хопіць, каб стаць дэпутатам.

Але я ведаю, што на нашых выбарах галасы даўно ўжо не лічацца. У выбарчых камісіях старшыня і сакратар прызначаюцца з тых, хто служыць райвыканкаму, залежыць ад яго фінансава і выканае любы загад, нават шляхам парушэння заканадаўства. А дзейснае назіранне за ходам выбараў правесці немагчыма.

Дый праводзіць выбары сёння няма аніякой неабходнасці. Навошта выкідваць грошы на вецер? І так усё зразумела. На кожнае з 35-ці дэпутацкіх месцаў у нашым раёне прызначана па аднаму чыноўніку. Які тут выбар?

Яны самі кажуць, што стараюцца зрабіць наша жыццё лепшым. Але пакуль што лепшым яны зрабілі толькі сваё жыццё. Скажам, заробак старшыні Талачынскага райвыканкаму за мінулы год склаў 140 мільёнаў рублёў. Заробак нашага абласнога дэпутата Мацюшкі – амаль 164 мільёны. Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Мацкевіч летась за год меў 239 мільёнаў. Гэта складае 12-15-20 мільёнаў у месяц.

А за што? За дзяльбу нашых грошай, якія яны спачатку забіраюць у бюджэт з нашых заробкаў, а потым вяртаюць нам назад у выглядзе рамонту бальніцы ці замены вокнаў у школе? І тое выдаецца за амаль што царскі падарунак чыноўніка. Хаця на справе больш грошай мы трацім на іх утрыманне.

Нашыя ж праблемы не вырашаюцца гадамі. Напрыклад, і сёння просты люд гандлюе на Бешанковіцкім рынку, раскладаючы свой тавар у любое надвор'е на голай зямлі.

Праблем у нас шмат. Лепш за ўсё пра іх сведчыць тое, што летась у раёне зачынілі дзве школы. А сёлета зачыняць яшчэ дзве ці тры. Нават такія вёскі як Свяча, Плісы, Рубеж, Сініцы – на мяжы вымірання. Колькасць дзетак за апошнія 13 гадоў у раёне паменшылася на 2 000. Было 3 500, стала 1 500. Больш чым у два разы!

Закрыццё школ і выміранне вёсак гавораць пра поўны крах аграрнай палітыкі. І ніводзін раённы чыноўнік-дэпутат не выступіў супраць гэтай палітыкі. Бо тое б значыла страціць утульнае крэсла і аклад.

Мы ўпэўнена выміраем. Нас крыху больш за 16 000 чалавек, а яшчэ ў 2005-м годзе было больш за 20 000.

Нізкія заробкі і пенсіі, высокая смяротнасць, знішчэнне помнікаў культуры, наўкол сметнікі і пабітыя дарогі – вось што мяне хвалюе ў першую чаргу. Супраць гэтых праблем трэба паўставаць усім светам, для змагання з імі эканоміць кожны рубель.

А налічаць ці не налічаць мне галасы на выбарах, мяне гэта не надта хвалюе. Усё роўна я буду змагацца супраць засілля чынавенства, за тое, каб людзі ведалі праўду. І маючы статус дэпутата я змог бы зрабіць для Вас значна больш.

Прыгледзьцеся да тых людзей, за каго Вас прымушаюць галасаваць. Калі яны не жывуць у вашай мясцовасці, не ходзяць тымі ж сцежкамі, што і Вы, не ведаюць вашых праблем, ды ў дадатак займаюць утульныя месцы чыноўнікаў – гэта не Вашы дэпутаты.

Я ўпэўнены, толькі тады, калі на месцы народных абраннікаў прыйдуць простыя людзі з народа, наша жыццё зменіцца да лепшага.

Г.Станкевіч

*****

Пакуль цябе сьцеражэ твая смага,
пакуль у табе трымаецца вера,
сонца рухаецца з дакладнасьцю птаха
і час падбіраецца з асьцярожнасьцю зьвера.

Айчыны позьняя вакзальная аблава,
цёплыя рукі і снежаньскія дарогі.
Краіна баліць, як перабітая лапа
шчанюка, што вырываецца з начной аблогі.

Вырывайся, вырывайся з ночы й туману
выгрызай роспач і безнадзейнасьць.
Я потым загаю тваю страшную рану,
наколькі змагу я, наколькі пасьпею.

Я потым зразумею, потым пабачу,
калі не прыйдзецца дзесьці памерці,
усю гэту тваю беспрытульнасьць сабачую,
ўсю гэту тваю дзіцячую вернасьць.

Пакідай ні з чым іх подлую варту,
абыходзь расстаўленыя ўмела пасткі.
Варта біцца і падымацца варта,
калі нават зноў давядзецца ўпасьці.

Зорны рой будзе віснуць над табою,
або ірвацца, як ручныя гранаты.
Сэрца мае заліецца крывёю
і будзе яе зноў і зноў ганяці.

Косьці мусяць трывала зрастацца.
Шнары павінны дадаваць злосьці.
Штось і з табою павінна стацца,
калі ты сказала уголас "Досыць!"

Пакуль ты ўсім гэтым жывеш і марыш.
Пакуль вырываешся, пакуль палюеш.
Пакуль ты ўсё гэта ў сабе трымаеш.
Пакуль ненавідзіш. Пакуль любіш.

Сергій Жадан
(пераклад з украінскай Г.Станкевіча)

ГАВОРАЦЬ ЛІЧБЫ

АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ РАЗВІЦЦЯ ЗА 2013-Ы ГОД

На сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь размешчаны статыстычныя дадзеныя за мінулы год.

Колькасць насельніцтва Бешанковіцкага раёна на канец 2013 складала 16 448 чалавек, (нарадзілася 150, памерла 367, натуральнае зніжэнне склала 217 чалавек: на 217 чалавек больш памерла, чым нарадзілася).

У эканоміцы занята 7 271 чалавек. Лічба за год знізілася на 247 чалавек. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,8%. Усяго ў раёне 248 зарэгістраваных юрыдычных асоб.

Прамысловая вытворчасць склала 131, 9% да ўзроўню 2013 года. Сельская гаспадарка скончыла 2013 год з мінусам да папярэдняга (72,4% да 2013 года).

Нягледзячы на тое, што пагалоўе кароў узрасло на 140 галоў і склала 6 365 галоў, вытворчасць малака ўзнялася нязначна і склала 1 990 тон (было 1 906).

Калі ў студзені 2013-га года ў раёне было 23 928 галоў свіней, то ў студзені 2014-га года іх не было зусім.

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ і паслуг на аднаго работніка склала 206,1 млн. рублёў(год таму была 173, 2 млн).

Стратныя арганізацыі зараз складаюць 8,7% ад іх агульнай колькасці.(Год таму іх не было.)

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата склала 3 869 800 рублёў, што складае 84,6% да абласнога ўзроўню.

У наяўнасці маецца 5 509 кв.м. невыкарыстоўваемай маёмасці.

М.Васільеў

ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

ЯК НАМ АДРАДЗІЦЬ СЯЛО

Сельскія праблемы ў Беларусі – адны з самых складаных. Па-першае, ім шмат дзесяцігоддзяў. Па-другое, апошнія 20 гадоў іх сур'ёзна і не спрабавалі вырашаць. І, па-трэцяе, проста сёння ўсе людзі імкнуцца да лёгкага жыцця, у горад.

Вось і застаюцца ў вёсцы тыя, хто, мякка кажучы, нідзе сябе больш не знайшоў. І колькі яшчэ энтузіястаў. Вось чаму за гэтых апошніх трэба трымацца абедзьвюма рукамі, "не выпускаць" іх.

Калі 20 гадоў таму у Беларусі з'явілася магчымасць фермерства, за яго трэба было чапляцца, як за ратавальны круг. Бо фермер не бывае выпадковым. Гэта значыла, што на вёсцы з цягам часу з'явяцца моцныя сем'і, а, значыць, і дзеці ў школах.

Толькі стаўка была зроблена на калгасы. Праўда, іх пераназвалі па-другому. Але гаспадароў у вёсцы ад гэтага не дабавілася, цяпер там у асноўным не гаспадары, а перакаці-поле.

Сёння мы стаім перад фактам поўнага краху дзяржаўнай аграрна-дэмаграфічнай палітыкі. І калі мы хочам паправіць становішча, гэты факт трэба найхутчэй прызнаць. А потым дзейнічаць.

Асновай адраджэння сяла мусіць стаць моцны гаспадар. Якім чынам яго трэба "прымусіць" тут з'явіцца – справа дзяржаўнай важнасці. Патрэбныя льготы, датацыі, ідэалагічная праца. То-бок заканадаўчая база. Бо паехаць з горада ў вёску сёння можна толькі тады, калі тут будзе магутная фінансавая дапамога і добрыя перспектывы. Сюды павінны ісці таленавітыя людзі, якія хочуць, могуць і любяць працаваць, якія асядуць тут назаўсёды.

У адваротным выпадку вёска сап'ецца, дэградуе і загіне да канца.

Тое, што ў вёсцы можна добра зарабляць, не сакрэт. Я сёння трымаю тры каровы. І гадавы даход, які сям'я атрымоўвае ад жывёлы, перавышае мой і жончын заробак па месту працы. Гэтыя тры каровы даюць нам прыкладна столькі ж, колькі атрымоўвае даярка вялікага комплексу. Там яна працуе наёмнай працаўніцай, доіць сотню галоў, але корміць пры тым сотню чыноўнікаў калгаснага, раённага, абласнога і рэспубліканскага разліву. (Дзякуй Богу, яшчэ не стварылі саюзныя структуры.)

Праца па такому рэфармаванню вёскі зойме не адно дзесяцігоддзе. Але яе трэба пачынаць праводзіць ужо сёння, найхутчэй. Дзейсная ўлада на такія рэформы не пойдзе, бо з'яўленне гаспадара ў вёсцы азначае ліквідацыю шматлікіх чыноўнікаў, якія тут жыруюць. А яны-то гаспадарамі ніколі не былі і не будуць.

Над маімі каровамі начальнік я сам. Я сам планую, чым я іх буду іх карміць, калі даіць і куды прадаваць малако.

Толькі тады, калі падобная сістэма запрацуе ва ўсёй нашай сельскай гаспадарцы, з'явіцца надзея, што наша сяло адродзіцца.

Г.Станкевіч.

НАШЫ СТРАТЫ

БАРАДУЛІН ВЯРНУЎСЯ Ў КРЭЎНУЮ ЗЯМЛЮ

Паэта пахавалі побач з маці ва Ушачах

Падчас развітання з Рыгорам Барадуліным каля яго роднай хаты ва Ушачах зусім павеснавому грэла сонца. Падчас адпявання на могілках яно заходзіла, хавалася за небакрай. Ніхто - ні людзі, ні неба, ні зямля - не верылі, што сонца беларускай паэзіі больш няма.

На развітанне з выбітным земляком - народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным - ушачане пачалі прыходзіць яшчэ за дзве з паловай гадзіны да таго, як з Мінска прыехаў жалобны катафалк. Людзі збіраліся купкамі на роднай вуліцы дзядзькі Рыгора - Школьнай. Тут, пад старымі ліпамі і бярозай, знаходзіцца лецішча, куды паэт прыязджаў штолета. У райцэнтры, бадай, няма ніводнага, хто не чуў бы гэтага імя. Таму людзей прышло багата.

Мужчыны і жанчыны ціха гутараць паміж сабой, узгадваюць, якім чалавекам быў іхні зямляк - шчырым, гасцінным, простым, працавітым, вельмі адкрытым. Калі папросіш, то чытаюць ягоныя вершы. Найчасцей, канешне ж, дэкламуюць "Трэба дома бываць часцей".

У залежнасці ад ступені знаёмства з ім ушачане называюць Барадуліна "наш Грыша", "дзядзька Рыгор", "Рыгор Іванавіч". Але ў голасе ці ў вачах амаль кожнага, з кім давялося гутарыць, - слёзы. "Ой, жалка Грышу, як жа жалка..." - плача нейкая бабулька.

Бліжу пяці вечара каля дома на Школьнай, 6 спыняецца катафалк. Труну ставяць ля ганка хаты. Удава Валянціна Міхайлаўна ціха кажа: "Ну вось, Грышачка, і прывезлі цябе дадому..." Сярод тых, хто выказвае ёй спачуванне, - сястра Васіля Быкава Валянціна Уладзіміраўна, якая жыве ў вёсцы Ваўчо пад Ушачамі.

Развітваліся з дзядзькам Рыгорам пад бацькавым вязам - дрэва яшчэ перад вайной пасадзіў Іван Рыгоравіч Барадулін. А бярозу на падворку пасадзіў ужо сам паэт - калі памерла яго бабуля Малання.

Правесці ў апошні шлях волата беларускага прыгожага пісьменства прыехалі многія людзі з Мінска, Віцебска, Полацка, іншых гарадоў і мястэчак. Сярод іх літаратары Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў, Андрэй Хадановіч, Барыс Пятровіч, Уладзімір Папковіч, журналісты Сяргей Шапран, Глеб Лабадзенка. Было шмат віцебскай інтэлігенцыі - мастакоў, супрацоўнікаў драмтэатра, выкладчыкаў.

Пачынаецца жалобны мітынг. Першай слова бярэ намесніца старшыні Ушацкага райвыканкама Наталля Марковіч. Потым выступаюць літаратары. Барыс Пятровіч звяртаецца да землякоў Барадуліна, каб тыя зберагалі яго памяць. Уладзімір Арлоў прыгадвае факт, што і Васіль Быкаў, і Рыгор Барадулін адышлі ў іншы свет у 79 гадоў і некалькі дзён: "Нібы змовіліся". Потым падыходзіць да труны і, накрываючы паэта бел-чырвона-белым сцягам, тлумачыць: "Гэтым жа сцягам накрывалі і труну Быкава".

Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ Іосіф Навумчык перадаў родным паэта спачуванні ад старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілы.

Уладзімір Някляеў зачытвае ліст ад Генадзя Бураўкіна, які не змог прыехаць ва Ушачы па стане здароўя: "...Ты - з намі. Мы дыхаем з табой. Жывем з табой. Ты будзеш жыць доўга побач з Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Васілём Быкавым. Не хачу і не магу сказаць: жыў. Не маю права. Не мела права і здарыцца тое, што здарылася. Ты - з намі".

Ад сябе Някляеў, звяртаючыся да землякоў дзядзькі Рыгора, дадае: "Барадуліна не адпускалі са сталіцы. Казалі: ён належыць усёй Беларусі і павінен быць пахаваны ў Мінску. Але ягоная воля: "Я хачу быць у сваёй зямлі, побач са сваёй мамай. Сюды, у гэту крэўную родную зямлю ён і пакладзецца, побач з матуляй. І я спадзяюся, што памяць пра яго вы і вашы нашчадкі пранясеце годна".

Жалобная працэсія едзе на могілкі, якія знаходзяцца прыкладна ў 2,5 км ад роднай хаты нябожчыка.

Развітанне тут пачынаецца з набажэнства, якое праводзяць святары рыма-каталіцкай і грэка-каталіцкай канфесій. Затым труну нясуць да магілы маці літаратара - Акуліны Андрэеўны Барадулінай. Яна памерла ў 1971 годзе.

Могілкі ва Ушачах дужа незвычайныя - старыя, пагорыстыя. Многія людзі стаяць на ўзвышшы, як у амфітэатры, і таму добра бачаць жалобную цырымонію. Адныя не хаваюць слёз, другія проста знаходзяцца ў нямым здранцвенні ад гора.

Калі труну апусцілі ў магілу і пачалі засыпаць яе зямлёй, людзі заспявалі гімн "Магутны Божа".

Пахаванне скончылася на пачатку восьмай вечара. Было ўжо цёмна. Але людзі не спяшаліся разыходзіцца. Каля магілы народнага паэта ўключылі асвятленне - яго тут правялі адмыслова: на выпадак, калі развітанне зацягнецца. Людзі ўсё неслі і неслі вянкі і кветкі. Іх было столькі, што яны ледзь на схавалі крыж над магілай паэта і помнік над месцам спачыну яго маці.

Ніхто не верыў. Не хацеў верыць. Не верыцца і зараз. Суцяшае адно - малітва. Дзядзька Рыгор адышоў туды, дзе няма ні болю, ні гора, ні смутку...

Вельмі трапнымі падаюцца словы апостальскага нунцыя ў Беларусі арцыбіскупа Клаўдыё Гуджэроцці з імшы развітання з паэтам: "Веру, што беларусы, якія разам з іншымі святымі жывуць у ззянні Божага святла, выйдуць яму насустрач, каб падвесці яго да Бога. І, быць можа, Бог прывітае яго ў сваім доме простымі словамі, якімі беларускае сэрца вітае гасцей: "Калі ласка, Рыгор".

Таццяна Мацвеева

МЯСЦОВАЯ КАМПАНІЯ

КАНДЫДАТЫ Ў РАЁННЫЯ ДЭПУТАТЫ – СКРОЗЬ ЧЫНОЎНІКІ

Сталі вядомыя імёны кандыдатаў у дэпутаты, якія зарэгістраваныя ў Бешанковіцкі раённы Савет.

Тут на 35 месцаў прэтэндуе 36 чалавек. Адзінай акругай, дзе ёсць альтэрнатыва і можна будзе рабіць нейкі выбар, з'яўляецца Пушкінская акруга №13. Па ёй вылучаюцца райвыканкамаўскі чыноўнік Уладзімір Кухто і настаўнік Каранеўскай школы Георгій Станкевіч.

Дарэчы, з 36-ці кандыдатаў роўна трэць – 12 чалавек – складаюць райвыканкамаўскія чы-ноўнікі. Яшчэ палова – дырэктары самых розных прадпрыемстваў, якія падпарадкоўваюцца рай-выканкаму. Двое – з раённай "Зары". І апошні – старшыня Савета народных дэпутатаў Генадзь Шведаў, які, думаецца, і застанецца на сваім пасту наступныя чатыры гады кіроўцам чынавенства.

Па партыйнаму складу толькі адзін кандыдат з'яўляецца вылучэнцам камуністаў, астатнія – беспартыйныя.

У параўнанні з выбарамі чатырохгадовай даўнасці змяненні ў спісе кандыдатаў мінімальныя. Замест тых чыноўнікаў, якія выйшлі на пенсію, на "кандыдыцкую пасаду" вылучылі іншага. Напрыклад, замест Івана Жарабцова вылучаецца Святлана Салоха, якая замяніла яго на пасадзе начальніка раённага аддзела адукацыі.

Калі чатыры гады таму безальтэрнатыўнымі былі 32 акругі з 34-х, то зараз без альтэрнатывы будуць 34 акругі з трыццаці пяці.

Ці можна ўсё тое назваць выбарамі? Адназначна не. А таму віншуйце чыноўнікаў-дэпутатаў ужо сёння.

М.Васільеў

НАШЫ ЗАРОБКІ

ЗАРПЛАТА Ў РАБОТНІКАЎ ПАМЕНШЫЛАСЯ

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Віцебскай вобласці ў першым месяцы бягучага года склала 4.748.912 і за месяц звалілася на 419.549 рублёў. Зніжэнне зарплаты назіраецца і па краіне ў цэлым.

Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у студзені 2014 склала 5.322.441 рублёў, і паменшылася ў параўнанні са снежнем 2013 на 9,1%, або на 532,2 тысячы рублёў.

Нагадаем, уякасці «навагодняга падарунка» у снежні мінулага года зарплата ў работнікаў Віцебшчыны вырасла на 459 тысяч, па краіне - на 505.900 рублёў. На жаль, усяго на месяц.

Рэальная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені 2014 у параўнанні з студзенем 2013 павялічылася на 5,8%, аднак у параўнанні з снежнем 2013 паменшылася на 10,5%.

Тройка лідэраў студзеня выглядае наступным чынам:

Мінск - 7.169.494 рублёў;

Мінская вобласць - 5.123.998 рублёў;

Гомельская вобласць - 4.970.285 рублёў.

Сярэдні заробак за студзень у Гродзенскай вобласці быў роўны 4.970.285, у Віцебскай - 4.748.912, у Магілёўскай - 4.722.322, у Брэсцкай - 4.642.779 рублёў.

Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь па асобных відах эканамічнай дзейнасці ў студзені 2014 (тыс. рублёў).

У студзені 2014 года ў будаўніцтве сярэдняя заработная плата склала 6 538,6 тыс. рублёў, на транспарце і ў сувязі - 6 104,8 тыс., у прамысловасці - 5 903,9 тыс., у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы - 3 842,5 тыс., у адукацыі - 3 657,7 тыс., у тым ліку настаўнікаў - 4 305,6 тыс., прафесарска - выкладчыцкага складу - 5 985,3 тыс. рублёў.

Заработная плата работнікаў аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг у студзені 2014 сложилась ў памеры 3 812,4 тыс. рублёў, у тым ліку ў галіне аховы здароўя - 3 902,6 тыс. рублёў.

Сярэдняя заработная плата ўрачоў склала 6 164,7 тыс. рублёў, сярэднягамедыцынскага персаналу - 3 760,6 тыс. рублёў.

Нагадаем, гаворка ідзе пра сярэдніх паказчыках па галіны і аб налічанай зарплаце, то ёсць пра торбах без уліку розных вылік.

Дзмітрый Дзежыц "Хімік"

АХОВА ПРЫРОДЫ

ПРАВЕРАНА ВЫКАНАННЕ ПРЫРОДААХОЎНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

Віцебскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праведзены планавыя праверкі выканання прыродаахоўнага заканадаўства 19 суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку ААТ "Бешанковічы аграсервіс".

Па выніках кантрольнай (наглядна) дзейнасці камітэтам і тэрытарыяльнымі органамі складзена 14 актаў і 5 даведак праверак выканання прыродаахоўнага заканадаўства. Выдадзена 14 прадпісанняў аб ліквідацыі парушэнняў з указаннем тэрмінаў выканання па 148 пунктах мерапрыемстваў.

Асноўнымі парушэннямі прыродаахоўнага закана-даўства, устаноўленымі пры правядзенні праверкі на ААТ "Бешанковічы аграсервіс" з'яўляюцца адсутнасць :

– інструкцыі па правядзенні вытворчага экалагічнага кантролю;

– ўліковай дакументацыі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;

– інвентарызацыі выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферне паветра;

– кантролю выкідаў таксічных рэчываў і дымнасці адпрацаваўшых газаў аўтамабіляў;

На ААТ "Бешанковічы аграсервіс" не арганізаваны таксама збор другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Па выніках праведзеных праверак суб'ектаў гаспадарання за парушэнні прыродаахоўнага закана-даўства складзена 26 пратаколаў, накладзена 23 штрафы на суму 10,8 млн. рублёў. Па фактах прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю прад'яўлена 2 прэтэнзіі на суму 5,7 млн. рублёў.

Колькі штрафных санкцый накладзена асобна на бешанковіцкую арганізацыю, не паведамляецца.

У.Ліпскі

АБ'ЯВА

• Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Крывінка» паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэлефануйце.

• Калі прачыталі "Крывінку", то калі ласка, перадайце знаёмым.

• Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamnikat.org/kryvinka.html каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

МЯСЦОВАЯ КАМПАНІЯ

МІЛІЦЫЯ ПРАВЕРЫЦЬ ЗАКОННАСЦЬ ДЗЕЯННЯЎ ВІЦЕБСКАЙ КАМІСІІ

Са скаргай на дзеянні сябраў Віцебскай гарадской выбарчай камісіі звярнуліся ў Следчы камітэт актывісты Руху «За Свабоду» Хрыстафор Жаляпаў і Аляксей Гаўруцікаў. Зварот быў накіраваны на праверку ў міліцыю.

У скарзе актывісты Руху «За Свабоду» адзначылі, што не былі зарэгістраванымі ў якасці кандыдатаў у дэпутаты Віцебскага гарадскога савету. Яны адзначылі, што выбарчая камісія знайшла ў іх подпісы, якія былі прызнаныя несапраўднымі (116 у Жаляпава, 103 – у Гаўруцікава).

Абодва лічаць, што ім адмовілі па палітычных прычынах, бо яны з'яўляюцца сябрамі Руху «За Свабоду» і Партыі БНФ, у складзе іх ініцыятыўных групаў знаходзіцца старшыня Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілін-кевіч.

Палітыкі прыво-дзяць прычыны, па якім лічаць адмову аб адсутнасці рэгістрацыі не-законнай. У прыватнасці тое, што большасць выбаршчыкаў, якія падпісалі заявы пра тое, што не ставілі подпісы, на паўторнай праверцы заявілі, што зрабілі гэта таму, што іх увялі ў зман.

Жаляпаў і Гаўруцікаў просяць праверыць факты парушэння заканадаўства сябрамі Віцебскай гарадской выбарчай камісіі, за парушэнні заканадаўства і падлог дакумантаў прыцягнуць да крымінальнай адказнасці старшыню Віцебскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў гарадскога Савета дэпутатаў Валянціну Казакоўскую.

10 сакавіка Следчы камітэт Беларусі адказаў, што скарга зарэгістраваная і перанакіраваная для разгляду ў упраўленне ўнутраных справаў Віцебскага аблвыканкама.



Газета "Новы час"

УКРАІНСКА-РАСІЙСКІ КАНФЛІКТ

«... НЕОБХОДИМОСТЬ В БЕЛОРУССКОЙ ВИТРИНЕ ДЛЯ ПУТИНА ОТПАДЕТ»

Экономисты рассказали «Салідарнасці» в экспресс-комментарии о том, как повлияет украинско-российский конфликт на экономику Беларуси.

Руководитель аналитического центра «Стратегия» Леонид Заико убежден, что события в Крыму принесут пользу белорусской экономике. Об этом он рассказал «Салідарнасці» в экспресс-комментарии.

— В ответ на действия России в Украине Запад начал сворачивать инвестиционную активность в российской экономике. Была предпринята неудачная попытка обрушить фондовый рынок России. В результате чего часть спекулятивного капитала была выведена из страны. Теперь нужно ожидать, что Россия перестанет поощрять импорт товаров из западных стран. Для белорусских производителей в связи с этим открываются неплохие перспективы занять эти ниши. Тем более, что Беларусь является участником Таможенного союза.

Экономист напомнил, что основным стратегическим товаром белорусского экспорта в Украину являются нефтепродукты, произведенные из российской нефти. В сумме, около 70% от общего объема поступлений от экспорта. Леонид Заико считает, что ожидать сокращений здесь не стоит.

Из Украины в Беларусь завозится на сотни миллионов долларов корм для скота. В основном это жмых — продукт переработки подсолнечника на растительное масло.

— Жмых будет при всех правительствах и революциях, — говорит экономист. И добавляет, что не стоит беспокоится и за украинский металлопрокат, чью продукцию также закупает Беларусь.

Ранее в комментарии «Салідарнасці» доктор экономических наук, профессор Борис Желиба высказал мнение, что Беларусь

(працяг на стар. 4)

МЫТНАЯ ТРОЙКА

ПУТИН НЕ ДОЖДАЛСЯ ПОДДЕРЖКИ ПО УКРАИНЕ

Владимир Путин не получил от партнеров по таможенной тройке поддержки своей политики на украинском направлении. Это стало ясно после экстренного саммита 5 марта в Ново-Огареве.

Формально лидеры России, Беларуси и Казахстана обсуждали договор о Евразийском экономическом союзе (ЕАЭС), но, конечно, в воздухе висел украинский вопрос.

Кремль в изоляции

Это заседание Высшего Евразийского экономического совета на уровне глав государств прошло на шесть дней раньше планового срока, причем накануне Нурсултан Назарбаев не скрывал, что это его инициатива, поскольку «обстановка на Украине непосредственно затрагивает взаимоотношения стран в рамках СНГ и косвенно касается государств Таможенного союза».

Если же без дипломатии, то, как убеждены многие наблюдатели, поведение Москвы в Крыму, закамуфлированное под защиту русскоязычных, абсолютно не понравилось лидеру Казахстана, где целые области — преимущественно русскоязычные.

У Беларуси, отмечают аналитики, также нет ни одного резона портить отношения с Украиной в угоду великодержавным амбициям Кремля.

«Главным итогом этой встречи стало то, что на ней не прозвучало», — заявил в комментарии для Naviny.by политический аналитик Юрий Дракохруст. Он уверен: в ситуации конфликта с Украиной, когда Кремль оказался практически в изоляции, ему критически важно было получить поддержку союзников. Но этого не получилось.

Если бы казахстанский и белорусский руководители сказали в ободряющем духе хоть пару слов, то их позиция была бы броско отражена в российских сообщениях по итогам саммита. Однако, судя по всему, Москва не получила даже косвенной поддержки, говорит аналитик. «И это — серьезное поражение Путина», — заключает собеседник Naviny.by.

«Обвяжем ЕЭП ленточкой с бантиком»

Дискуссию же вокруг ЕАЭС Юрий Дракохруст называет «обычными терками, которые были и на прежних саммитах». Причем если раньше стороны реагировали на доводы друг друга, то нынешнее общение, по крайней мере в официальной интерпретации, больше напоминает, по выражению аналитика, «диалог глухих».

Действительно, Путин вроде как попытался сделать запевку на украинскую тему («Экстраординарная ситуация, сложившаяся на Украине, вызывает серьезное беспокойство… Возможны негативные последствия и для рынка Таможенного союза»), но партнеры или не подхватили пас, или наговорили такого, что нельзя было давать в отчете на публику.

С другой стороны, как ни взывал Александр Лукашенко к необходимости убрать все изъятия, касающиеся товаров (читай: русские, ну снимите же, наконец, свои пошлины на экспорт нефтепродуктов!), российский коллега, судя по отчетам, отделался холодной фразой: мол, следует зафиксировать конкретные обязательства по устранению изъятий и ограничений, сохраняющихся в Таможенном союзе и ЕЭП (читай: а пожертвуйте-ка хоть чем-то и вы!).

И это выглядит даже регрессом, потому что на предыдущих саммитах Путин более четко артикулировал, что готов пойти на жертвы, в частности, отменить экспортные нефтепошлины, что особенно важно для пополнения белорусского бюджета (цена вопроса — от трех до четырех миллиардов долларов в год).

В то же время российский президент настаивает, что ЕАЭС необходимо наделить широким набором полномочий в сфере экономического регулирования. Но казахстанский и особенно белорусский руководители в этом вопросе более чем осторожны. Авторитарные политики хотят быть и полновластными хозяевами своих экономик, делегирование же ряда функций на наднациональный уровень может их в этом плане серьезно стеснить.

Показательно и то, что Лукашенко попенял: мол, появились подходы, когда отмену изъятий по товарам начали увязывать с отменой изъятий по услугам, капиталу и рабочей силе. «Свобода движения товаров должна стать примером для решения задачи по реализации остальных трех свобод», — изящно выразился белорусский президент.

Расшифровать птичий язык можно так: белорусская сторона спешит застолбить в соглашении о ЕАЭС выгодные для себя позиции и, напротив, хочет отодвинуть фиксацию не очень выгодных. Потому что свобода движения товаров — это доступ на российский рынок и энергоресурсы по выгодным ценам. А вот свобода капиталов чревата тем, что российские толстосумы скупят не очень большую и не очень богатую Беларусь в два счета.

В целом же работу над функциональной частью договора о ЕАЭС (то есть той частью, где не декларации, а конкретика) Лукашенко де-факто оценил как топтание на месте. Мол, «несмотря на активизацию работы, готовность проекта оценивается все теми же 70-80%, о которых речь шла на предыдущей встрече. Сближения по наиболее чувствительным позициям для каждой из сторон практически не произошло».

При этом белорусский руководитель — за то, чтобы подписать интеграционную бумагу в срок. Он предложил принимать пункты проекта договора консенсусом: «Если же кто-то против — включать в проект договора нормы соглашений ЕЭП в их неизменном состоянии, которые есть на сегодняшний день, чтобы не допустить хода назад».

По мнению Юрия Дракохруста, месседж здесь таков: «Если уж Владимиру Владимировичу так горит, то обернем теперешний ЕЭП красивой материей, обвяжем ленточкой с бантиком — и вручим подарочек к 1 января 2015 года».

Кончатся московские пряники — конец интеграции

Евразийский экономический союз могут запустить в духе советской традиции сдавать объекты с недоделками, отметил в комментарии для Naviny.by минский обозреватель-международник Андрей Федоров.

Намеченные сроки могут быть соблюдены, но если не удастся развязать спорные вопросы, уйти от тех же изъятий, то ЕАЭС «постигнет судьба предыдущих постсоветских интеграционных образований — он не будет работать как надо», считает эксперт.

Федоров обращает внимание на неуступчивость Путина в экономическом плане. Казалось бы, сейчас, напротив, самое время умаслить партнеров. Что мешает?

«Не исключаю, что экономические проблемы», — говорит аналитик. Он напоминает, что вторжение в Крым еще ниже опустило рубль, вызвало обвал на фондовом рынке, отток капитала, «а теперь еще, возможно, придется брать на себя дотационный Крым, курортный сезон в котором, скорее всего, уже сорван».

Аналитики и раньше говорили, что на проекте Евразийского союза Москва может надорваться. Ведь он притягателен ровно в той степени, в какой Россия готова проплачивать партнерам участие в интеграции. Ресурсы Кремля и так истощались, призрак же новой крымской войны и вовсе грозит послать российскую экономику в нокдаун.

А когда у России кончатся пряники, всю ее постсоветскую интеграцию, и так анемичную, ожидает полный ступор.

Александр Класковский

БЕЛАРУСЬ - РАСІЯ

КРЫМ НАПУГАЛ ЛУКАШЕНКО

Шесть российских истребителей Су-27 были в четверг перебазированы в Бобруйск после того, как днем ранее принять у себя военные самолеты союзника предложил глава Беларуси.

Несмотря на этот шаг, белорусская элита чувствует себя все более неуютно на фоне событий, разворачивающихся на Украине.

Передислокация российских истребителей была осуществлена в рамках проверки боевой готовности вооруженных сил Беларуси.

«Будет проверена готовность к выполнению задач Единой региональной системы ПВО в целом с привлечением части ее российского компонента, что предусмотрено соглашениями в рамках Союзного государства», — отмечается в сообщении на сайте белорусского минобороны.

Днем ранее Лукашенко просил у Москвы на девять самолетов больше. «Беларусь предложит России разместить у себя дополнительно до 15 самолетов в связи с активностью НАТО», — говорил он.

Несмотря на эти воззвания белорусского лидера, в конфликте между Россией и Украиной Минск занял подчеркнуто нейтральную, а на деле — выжидательную позицию. Но если при этом большинству населения страны конфликт безразличен, то белорусские элиты однозначно настроены против России.

В своем отношении к украинско-российскому конфликту, к событиям в Крыму белорусское общество явным образом разделилось на несколько категорий, которые условно можно назвать «обыватели», «бизнес-элита», «интеллектуальная элита» и «верхушка власти».

«Обыватели» — это рабочие, бюджетники (учителя, врачи и т.п.), госчиновники невысокого ранга, продавцы в магазинах и прочие категории людей со средними доходами и уровнем образования. Белорусские обыватели, хотя и смотрят в основном российские телеканалы, тем не менее в большинстве своем не берутся судить, кто прав, а кто виноват в происходящем — и кому на самом деле должен принадлежать Крым. Обыватели руководствуются старой белорусской философией «лишь бы не было войны», имея в виду боевые действия собственно на белорусской территории. Ее за последние 300 лет не обошла стороной ни одна европейская война, так что страх перед вооруженным конфликтом у белорусов уже в крови.

«Бизнес-элита» в стране — отнюдь не олигархи российского или украинского образца.

Это прежде всего совсем не публичные личности, близкие к президентской семье и лично к Лукашенко. Эти люди зарабатывают, либо используя статус Беларуси как транзитной страны между Россией и ЕС, либо эксплуатируя формально принадлежащие государству промышленные ресурсы — нефтеперерабатывающие заводы, предприятия машиностроения, химические заводы.

Для белорусской бизнес-элиты независимость страны не является самостоятельной ценностью, но усиление влияния России в регионе ее реально пугает. До сих пор Лукашенко, несмотря на всю свою интеграционную риторику, избегал отдавать в руки россиян «лакомые куски» белорусской промышленности — такие активы, как МАЗ, Тракторный завод, «Гомсельмаш», Минский завод колесных тягачей, «Гродно-Азот», «Беларуськалий» и ряд других.

Однако если Россия «по украинскому образцу» усилит давление на Беларуси, то с этими активами Минску придется распрощаться, и белорусские бизнесмены не смогут в своей стране конкурировать с российскими олигархами.

Так что бизнес-элита Беларуси искренне желает Москве всяческих неудач в конфликте с Киевом.

«Интеллектуальная элита» Беларуси — писатели, артисты, ученые, журналисты (в том числе госСМИ), преподаватели вузов и т.д. — наоборот, в большинстве своем национально ориентированы и считают независимость высшей ценностью страны. В действиях России представители интеллектуальной элиты видят проявление «имперского синдрома» и реально боятся того, что после Украины вектор российской экспансии будет направлен на Белоруссию. Спасение же от нее, по их мнению, есть лишь одно: скорейшая интеграция в Европу.

Эти же люди с 1994–1996 годов составляют основу оппозиции Александру Лукашенко — как явной, так и скрытой. Многие продолжают считать Лукашенко «ставленником Москвы». Однако теперь белорусские власти быстро сориентировались — и начали играть на антироссийских настроениях интеллектуальной элиты страны.

Так, национальное телевидение в рамках документального сериала «Обратный отсчет» начало показ фильмов («1863-й. Под ударом империи»), восхваляющих героев антироссийского восстания 1863–1864 годов — так называемого восстания Кастуся Калиновского.

Повод — 150-летний юбилей восстания, которое для белорусов стало одним из ключевых событий истории.

Тогда впервые против российских властей на белорусской территории выступили не только мелкие дворяне (шляхта) и интеллигенция, но и простые крестьяне, незадолго до этого освобожденные от крепостного права.

Особенно неприятным для российских историографов стало то, что в восстании одинаково активное участие принимали как католики, так и православные — хотя последних до этого считали едва ли не оплотом царского режима на белорусской земле. Одновременно антироссийское восстание вспыхнуло в Польше — неслучайно девизом повстанцев стала фраза «За нашу и вашу свободу!». В итоге казненный русскими лидер восстания Кастусь Калиновский стал национальным героем Белоруссии, символом борьбы против российской оккупации.

«Сам тот факт, что белорусская государственная пропаганда стала воспевать повстанцев 1863 года, что она «перехватывает» у оппозиции фигуру Кастуся Калиновского как борца с русскими, говорит о многом, — считает белорусский политолог Виктор Демидов. — Лукашенко уже 20 лет у власти именно благодаря невероятному политическому чутью. Сейчас он чувствует, как стремительно растут в обществе антироссийские настроения. Чувствует — и использует их в своих целях. Смотрите: даже ведущие новостей одеты в цвета украинского флага — на белорусском госТВ таких случайностей не бывает».

Ну и, наконец, верхушка белорусской власти тоже изрядно напугана агрессивным поведением Москвы в регионе.

Главная причина страха — то, что пошел прахом подписанный в 1994 году Будапештский меморандум, согласно которому в обмен на отказ от ядерного оружия Россия, США и Великобритания гарантировали Украине и Беларуси территориальную целостность и политическую независимость. Также минское руководство понимает, что страна — своего рода европейский «балкон» для России, возможность разместить войска непосредственно на огромном отрезке границы с Евросоюзом.

«Лукашенко заявил, что «пугать нас не надо». В смысле, больше не надо. В самом деле, руководство страны и так напугано до чертиков. Конечно же, Минск примерил на себя украинский кризис московского покроя, — говорит руководитель аналитического проекта Belarus Security Blog Андрей Поротников.

— Можно сколько угодно утверждать, что у нас все хорошо, мы сильны и стабильны, но реальность отвратительна: если кто-то из внешних игроков решит расшатать ситуацию в Беларуси — сделать это будет несложно, хотя и потребуется несколько лет и значительные суммы. В Минске это понимают».

Эксперт напоминает, что Беларусь — слабая и малозначительная в масштабах мировой политики страна.

Выживание таких стран зависит от соблюдения крупными государствами международного права и системы региональных сдержек и противовесов. «В нашем регионе три крупных игрока: США (через Польшу), ЕС и Россия, — считает Поротников. — Гипотетический потенциал регионального лидера есть и у Украины.

Поэтому Беларусь жизненно заинтересована в сохранении единой Украины как одного из важнейших торговых партнеров, заинтересована в превращении Украины в сильную страну для поддержания равновесия в регионе. А в сильной России Минск не заинтересован. В стабильной — да».

Денис Лавникевич
Газета.Ру

УКРАІНСКА-РАСІЙСКІ КАНФЛІКТ

(пачатак на стар. 3)

уже испытывает негативный эффект от событий в Украине и вторжения в Крым России:

— В России наблюдается стагнация в экономике, очень важный для нас российский рынок будет сужаться. Украина также очень важный экономический партнер, но теперь там острый политический кризис.

Экономист Сергей Чалый считает, что пока крымский фактор никак не влияет на белорусскую экономику. Собеседник видит опасность для нее в другом. По мнению Сергея Чалого, Беларуси нужно бояться не присоединения Крыма к России, а полной потери Украины для Москвы.

— Другое дело будет, когда Путин поймет, что Украина потеряна навсегда. Ведь все его интеграционные проекты строились под Украину, без ее участия не имеют смысла. Мы в этом проекте исполняем роль витрины: смотрите как хорошо тем, кто дружит с Россией — дешевые энергоресурсы, кредиты. И если Украина, как основная цель Путина, будет потеряна, необходимость в такой витрине, скорее всего, отпадет.

Семен Печенко
gazetaby.com/cont/art.php

ПОГЛЯД З РАСІІ

ПУТИНУ БЕДНОМУ МОЗГ БОЛЬНОЙ СВЕЛО

Российский политолог считает, что Владимир Путин подписал себе смертный приговор. Об этом Станислав Белковский пишет в своем блоге на сайте «Сноб».

Приводим текст его поста полностью:

«Мы очень долго сидели и думали, когда же падет режим Владимира Путина и как это может случиться. Сегодня Владимир Владимирович дал нам исчерпывающий ответ на этот вопрос.

Я только что прибыл с совещания института судебной психиатрии им. Сербского, где мы с коллегами провели оценку происходящих событий. Мы поставили Владимиру Путину диагноз — гипертоксическая шизофрения. По психотипу он параноик, человек оборонительного сознания. Но под влиянием внешних сложных событий параноик может стать шизофреником. Путин действительно решил, что он великий человек и может вершить судьбу истории. Он не глупый, в человеческом плане я его уважаю, и больше меня его, наверное, не уважает никто. Но внешний импульс оказал на психику этого человека неизгладимое впечатление. Как говорилось в песне группы «Ноль», «человеку бедному мозг больной свело».

Этим переломным событием была сочинская Олимпиада. Путин настолько верил и ждал, что стадион «Фишт» обрушится во время церемонии открытия или закрытия —или что Россия проиграет Олимпиаду, что когда этого не случилось, он решил, что способен на все. В психиатрической литературе этот феномен описан как кесарево безумие: когда человека ничто не ограничивает, он перестает отдавать себе отчет в том, что он делает. Это синдром, очень близкий гипертоксической шизофрении. Жена Путина еще как-то удерживала его безумие, но он с ней развелся.

И вот мы имеем идею ввести войска в Украину. Утопить российский Черноморский флот можно двумя-тремя ракетами Пятого флота США, который находится в Бахрейне. Для этого даже не надо вводить Пятый флот в Черноморский бассейн, надо просто нажать кнопочку и запустить ракету. Мне очень интересно узнать, где завтра будут Владимир Жириновский и Геннадий Зюганов — главные бляди российской политики. Поскольку блядство — занятие профессиональное, а не любительское, как только они поймут, что Путину конец, они «заболеют». Посмотрим, где они будут завтра, — это очень важный индикатор.

У меня есть предположение, что вот-вот все кончится. Проблема в одном: что придет на смену всему? Это гораздо более важный и трагический вопрос, чем падение Владимира Путина, который наконец подписал свой смертный приговор. Которого, кстати, у него никто не просил».

Напомним, российские военные на протяжении последних дней захватили ряд объектов в Крыму. Кроме того, вооруженные боевики взяли штурмом административные здания в Донецке, Мариуполе и Харькове.

1 марта Совет Федерации России постановил дать согласие президенту РФ Владимиру Путину на использование Вооруженных сил на территории Украины.

Заснавальнік і рэдактар: Станкевіч Георгій Мікалаевіч

Адрас рэдакцыі: Бешанковіцкі раён, в. Старыя Ранчыцы, e-mail: stan62@list.ru, тэл. 60237, маб. +375292184739
Газета выдаецца з сакавіка 2005г.

Падпісана да друку 16.03.2014 у 16.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на ўласным абсталяванні.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.